Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-03-01

# На тым тыдні...

✓ **21 лютага** Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў Міжнародны дзень роднай мовы ў рамках Года кнігі і Купалаўскага юбілейнага года распачаў першы этап **грамадска-культурнай акцыі «Чытаем Купалу разам»**. Пад час мерапрыемства вершы паэта прагучалі ў выкананні запрошаных у музей міністра культуры Паўла Латушкі, грамадскіх дзеячаў і творцаў.

**У гэты ж дзень** Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа зладзіў літаратурную імпрэзу **«Матчын дарунак ад самай калыскі»**. Да ўрачыстай вечарыны была падрыхтаваная выстаўка «Якуб Колас і Нацыянальная акадэмія навук Беларусі: да вытокаў беларускай навукі аб слове» з фондаў музея, на якой прадстаўленыя рэдкія дакументы і матэрыялы, звязаныя з навуковай дзейнасцю Песняра.

***Падрабязней пра імпрэзы чытайце на стар. 3.***

✓ **22 лютага** ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі адбылася **прэзентацыя выстаўкі «Жыццё ў танцы»**, прымеркаванай да 110-годдзя з дня нараджэння таленавітага беларускага танцоўшчыка, балетмайстра, збіральніка беларускага харэаграфічнага фальклору Янкі (Івана Маркавіча) Хвораста (1902–1983).

Аснову экспазіцыі склалі дакументы і матэрыялы з асабістага архіва юбіляра, што распавядаюць пра жыццёвы і творчы шлях, рэдкія фотаздымкі Я. Хвораста розных гадоў і інш. Усе экспанаты выстаўляюцца ўпершыню.

✓ **22 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры ў рамках праекта «Дыяменты прыгожага пісьменства» адбылося **адкрыццё выстаўкі «“Песня Дзвіны” Тараса Хадкевіча» і аднайменная вечарына**, прымеркаваныя да 100-годдзя з дня нараджэння пісьменніка.

На мерапрыемства былі запрошаныя Анатоль Вярцінскі, Алесь Савіцкі, Навум Гальпяровіч, Мікола Аўрамчык, Сяргей Панізьнік, Анатоль Бутэвіч, Таіса Грамадчанка, землякі з Верхнядзвінскага раёна і родныя. Радкі з твораў пісьменніка прагучалі ў выкананні артыста Беларускага радыё Алега Вінярскага.

✓ **24 лютага** ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыўся вечар памяці Алеся Пісьмянкова **«Рыцар паэзіі»**, прымеркаваны да ягонага 55-годдзя. А. Пісьмянкоў – лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі і Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова. Падзяліліся сваімі ўспамінамі пра юбіляра яго родныя, блізкія, сябры і калегі Анатоль Вярцінскі, Васіль Зуёнак, Навум Гальпяровіч, Віктар Шніп, Генадзь Бураўкін, Леанід Дранько-Майсюк і інш.